пазнаюць нашу нацанальную апрычонасьць разам із славутаю гісtoраю народу нашага, што праходзіла пад назовам „Літва“. Ясна, што й Велікарусы ё Русы, Рускія. І таксама Беларусы — подле гэтага хвальшывага назову — ё „Русы“, „Рускія“. Мо’ хто скажа: „З назову «Беларусы» таксама відаць, што мы не Велікарусы ані Маларусы, а нейкія іншыя Русы“. Але іншыя — не запраўдныя, але хвальшывыя „Русы“. Хто, ідучы за назовам „Беларусы“, захоча зорыентавацца ў нашай накшасьці „рускай“, таго назоў „Беларусь“ зьвядзець да Маскоўшчыны, бо там ён быў паўстаўшы, і толькі пасьлей, за нашае няволі, быў прытарнаваны да нас, урынены нам. З тых жа — з хвальшывых жаролаў маскоўскіх — „даведаецца“, што й радзіліся мы вельмі позна і што першым гаспадарствам нашым ё „Беларуская савецкая рэспубліка“ — жудасная коленя маскоўская. Ані Беларусяй, ані Русяй у гісторы сваёй наш народ ня зваўся. Хвальшывы назоў можа давесьці толькі да хвальшу.

# Ivan Lubachko. Belorussia under soviet rule. 1917—1957 (Іван Любачка. Беларусь пад радзкаю ўладаю). Выданьне ўнівэрсытэту ў Кентукі ў Задзіночаных гаспадарствах Амэрыкі, 1972 г., б. 219)

Цануючы з большага працу проф. І. Любачкі, можна з пэўнасьцю сказаць, што сама тэма яе (Беларусь пад радзкаю ўладаю 1917—1957) напісана праўдзіва й вельмі добра. А што датыкаецца яе ўступу, зн. *historical background* (гістарычная мінуласьць), дык першыя восьмі бачынаў яго надта слабыя й разьмінаюцца зь гістарычнаю праўдаю. Прычына, відаць, тая, што аўтар скарыстаў тут літаратуру някрытычную або сьведама хвальшуючую гістору Вялікалітвы–Беларусі. З выняткам гэтых асьмёх бачын у іншым цэлым зьмесьце абмылы лучаюць там, ідзе зьмест тэксту залежны ад менаванае часьці ўступу.

Нядобра, што аўтар не назваў свайго краю праўдзівым яго назовам *Greatlitva* або *Greatlitva–Bielarus,* а яшчэ горай, што назваў яго *Belorussia* (Белорасія), як наш край, на’т па зрыненьню яму Масквою яе назову, ніколі ня зваўся (зваўся Беларусь, што паанґельску так і было б *Bielarus*).

# Паўла Урбан. У сьвятле гістарычных фактаў. Мюнхен, 1972, Нью Ёрк, бач. 129 вялікага фармату

Кніга в. добрая, кажны адукаваны Вялікаліцьвін мае яе мець. Як загану надабе адцеміць, што аўтар, прызнаючы балцкі субстрат народу влл., ня робе з гэтага ніякага вываду; а прымеж тога, што з гэных Балтаў адбілася ў нашым народзе, ё нашым. Прыкладам, імёны балцкага паходжаньня ё ня менш вялікалітоўскія, чымся імёны славянска–вялікалітоўскія.

Абмыльна аўтар думае, што тэрмін „Русь“ быў у старавеччу пашырыўшыся на часьць Севяран.